Першыя легкавыя аўтамабілі беларуска-кітайскай зборкі паступяць у продаж у лютым. Сабраны ў Беларусі легкавы аўтамабіль будзе канкурэнтаздольным не толькі на ўнутраным рынку, але і на рынку Мытнага саюза. СТАР. 2

Падведзены вынікі конкурсу малюнкаў, які праводзіла «Звязда». Дзеці атрымалі заданне намаляваць любімых герояў беларускіх казак, фальклору, унікальную беларускую літару «Ў»... СТАР. 6

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

30 КАНАЛАЎ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2013 г. ПЯТНІЦА № 20 (27385) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ У МАІ ЗАВЯРШЫЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ЗАКОНАПРАЕКТА АБ ЗМЯНЕННЯХ У ВЫБАРЧЫ КОДЭКС

Да змяненняў у выбарчым заканадаўстве трэба падыходзіць з пункту гледжання мэтазгоднасці, неабходнасці, запатрабаванасці беларускім грамадствам, адкінуўшы ўсе палітызаваныя, надуманыя ўстаноўкі і тыя, што навязваюцца звонку. Аб гэтым 31 студзеня заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытанні ўдасканалення выбарчага заканадаўства.

Адкрываючы нараду, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў свой час была дамоўленасць абмеркаваць усе прапановы, заявы і нараканні наконт выбарчай сістэмы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што з 2000 года ў Беларусі дзейнічае Выбарчы кодэкс, на падставе якога ў краіне былі праведзены чатыры парламенцкія выбарчыя кампаніі і адзін рэспубліканскі рэферэндум, тройчы праходзілі выбары кіраўніка дзяржавы і дэпутатаў мясцовых Саветаў. «Нягледзячы на папрокі нашых апанентаў, праведзеныя ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам выбары былі сумленнымі, адкрытымі, далі магчымасць забяспечыць волевыяўленне беларускага народа. Гэта сведчыць пра тое, што ў цэлым у нас выпрацаваны прававы механізм арганізацыі і правядзення выбараў. Ён працуе даволі дакладна і эфектыўна», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час Прэзідэнт лічыць, што, як любая працэдура, такі механізм не можа заставацца ў нязменнай, застылай форме. «Аднак яго ўдасканаленне не павінна прывесці да ломкі інстытутаў, якія ўжо існуюць і стабільна функцыянуюць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што гэта пытанне ён перад нарадай абмяркоўваў са старшынёй Канстытуцыйнага Суда. «Ніводны нарматыўна-прававы акт не можа быць дадзены раз і назаўсёды. Жыццё дынамічна змяняецца. Таму і нарматыўна-прававыя акты павінны паспяваць за бурнымі зменлівымі патокамі нашага жыцця. Дапускаючы некаторыя змяненні ў выбарчым працэсе, мы павінны зыходзіць з жыцця, ставячы перад сабой пытанне: нам гэта трэба, ёсць праблемы ў гэтым, якія праблемы?» — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка прывёў просты прыклад: «Існуе меркаванне, што трэба было б прадаставіць права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты грамадскім арганізацыям. У нас тысячы грамадскіх арганізацый, па-першае. Па-другое, адразу задаём пытанне: навошта? У нас што, дэфіцыт вылучэнняў кандыдатамі ў дэпутаты, ёсць праблемы з тым, што не хапае кандыдатаў у дэпутаты? Хапае, хоць гаць гаці. Дык навошта мы тады ўносім такія прапановы? Каб некаму спадабацца або наперад забегчы?»

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, «вось з гэтых выццёвых пазіцый перш за ўсё трэба падыходзіць да тых ці іншых змяненняў і дапаўненняў».

«Давайце да змяненняў падыходзіць з пункту гледжання мэтазгоднасці, неабходнасці таго ці іншага змянення, запатрабаванасці нашым грамадствам, каб мы для сябе не стварылі нейкіх праблем», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На яго думку, удасканаленне выбарчага заканадаўства павінна быць накіравана на прыняцце мер, якія забяспечваюць максімальную рэалізацыю грамадзянамі сваіх выбарчых правоў і ў той жа час даюць магчымасць процідзейнічаць спробам дэзарганізацыі выбараў. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што цяперашні Выбарчы кодэкс гэтаму пакуль адпавядае. «У нас праходзілі выбары на самым высокім узроўні. Адкінем тыя ангажыраваныя ацэнкі, якія выдавалі некаторыя нашы апаненты, а паглядзім на рэальную карціну, водгукі нашых добразычліўцаў, нейтральных людзей. Яны зайздросцяць таму ўзроўню выбараў, на якім яны праходзяць у нас. Усе гавораць, што гэта не толькі сур'ёзныя выбары грамадзянскай супольнасці, але і свята для людзей», — сказаў Прэзідэнт.

«Можна прыгледзецца і да рэкамендацый АБСЕ, выпрацаваных па выніках назірання за парламенцкімі выбарамі 2012 года. Аднак гэта не азначае, што мы згодны з усімі падыходамі АБСЕ, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы ж цудоўна разумеем, чаго хочуць ад нас людзі з АБСЕ. Мы гэта добра ведаем, мы ўжо гэта на практыцы памацалі. Таму рэагуючы на іх заўвагі, а там, зразумела, ёсць нармальныя заўвагі, мы павінны бачыць і той падтэкст, які стаіць за гэтымі прапановамі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна памятаць аб тым, што «ў Беларусі ўдасканальваецца нацыянальнае заканадаўства зыходзячы з інтарэсаў беларускага грамадства, а не па чыёйсьці ўказцы». «У гэтым выпадку як ніколі дарэчы слушная беларуская народная мудрасць — людзей слухай, а свой розум май!» — дадаў кіраўнік дзяржавы.

«Нам трэба адкінуць усе палітызаваныя, надуманыя ўстаноўкі і тыя, што навязваюцца звонку. Але пры гэтым уважліва прааналізаваць прапановы, якія адпавядаюць нашым нацыянальным інтарэсам, якія мы можам сёння прымаць», — адзначыў Прэзідэнт. СТАР. 2

■ Парламенцкі дзённік

СЕМ ПРОСЬБАЎ ЭНЕРГЕТЫКАЎ

Дэпутатаў папярэдзілі, ад каго будзе большая колькасць скаргаў пасля ўвядзення дыфтарыфаў

Асноўная праблема, якая была агучана на выязным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі на аб'ектах аб'яднання «Мінскэнерга», — непрапарцыянальны рост кошту паліва для энергетыкаў і тарыфаў на электрычную і цеплавую энергію для насельніцтва.

Просьба 1:

ДАЗВОЛІЦЬ КУПЛЯЦЬ ЛЕПШАЕ

Выязное пасяджэнне адбылося на базе рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскэнерга». Спачатку дэпутаты наведалі энергетычную падстанцыю «Калядзічы», адну з трох, якія абслугоўваюць беларускую сталіцу, і сёння самую сучасную з усіх. Потым дэлегацыя накіравалася на Мінскую ТЭЦ-3, дзе адбылася своеасаблівая вандроўка ў часе. Спачатку парламентарыям паказалі магутнасці паўвекавой даўніны, а затым — уведзеныя ў эксплуатацыю ў 2009 годзе. Асноўны лейтматыў прымаючага боку — пры мадэрнізацыі дазвольце купляць лепшае. Для энергетыкі надзейнасць — альфа і амега яе існавання. Лепшае, на думку энергетыкаў, вырабляюць сусветныя лідары, такія як, напрыклад, ABB і Siemens. На жаль, наша заканадаўства не заўсёды дазваляе заказчыку выбраць лепшага вытворцу абсталявання. «Няхай бы прадаўца выбіраў карыстальнік, а не эканамісты», — гучала пажаданне падчас агляду сучасных аўтатрансфарматараў, газатурбінных установак і электронных сістэм кіравання.

Просьба 2:

ПРАЦЯГНУЦЬ ПАВЫШЭННЕ ТАРЫФАЎ

— Мы сёння рэалізуем ужо другі план развіцця беларускай энергетыкі, — расказаў дэпутатам **намеснік міністра энергетыкі Міхаіл МІХАДЗЮК**. — Калі асноўнай мэтай папярэдняй праграмы было павышэнне надзейнасці энергасістэмы, то галоўная задача цяперашняй — павышэнне эфектыўнасці вытворчасці электрычнай і цеплавой энергіі. Ад гэтага залежыць жыццё і рэальнага сектара эканомікі, і насельніцтва.

На рэканструкцыю энергасістэмы ў бліжэйшыя 5 гадоў спатрэбіцца яшчэ $5,4 млрд. Эканамічны эфект ад рэалізацыі другой праграмы (у сённяшніх цэнах на газ) чакаецца ў памеры больш за $300 млн штогод. СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Васіль ЖАРКО, міністр аховы здароўя:

«Распрацоўкі беларускіх вучоных-медыкаў па мінімізацыі вынікаў, захаванні і ўмацаванні здароўя насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на ЧАЭС, уяўляюць сабой міжнародную цікавасць. Радыяцыйныя і сацыяльна-эканамічныя наступствы чарнобыльскай катастрофы па сваіх маштабах не мелі аналагаў за ўсю гісторыю атамнай энергетыкі. У свеце адсутнічаў навуковы і практычны вопыт ахоўных мер пры аварыях падобнага маштабу. За мінулыя пасля чарнобыльскай аварыі гады беларускімі вучонымі-медыкамі распрацаваны і ўкаранёны ў практыку цэлы шэраг унікальных арганізацыйна-метадычных рэкамендацый».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.02.2013 г.

Долар ЗША	8660,00	▲
Еўра	11740,00	▲
Рас. руб.	288,50	▲
Укр. грыўня	1065,85	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 1°
Віцебск	– 1°
Гомель	0°
Гродна	+ 1°
Магілёў	0°
Мінск	0°

■ Усё вышэй і вышэй

БОРТПРАВАДНІКОЎ НАВУЧАЦЬ УСМІХАЦЦА

Гэтую думку выказаў Ігар ЧАРГІНЕЦ, намеснік генеральнага дырэктара авіякампаніі «Белавія» на сустрэчы з журналістамі. Размова ішла пра тое, што было зроблена кампаніяй летась, а таксама пра планы на будучыню і тыя праблемы, з якімі зараз сутыкаецца «Белавія».

У мінулым годзе адкрыліся два новыя рэйсы — на Барселону і Новасібірск. Усяго за 2012 год «Белавія» перавезла амаль 1,3 мільёна пасажыраў, і гэты паказчык на 24% вышэйшы, чым у пазамінулым годзе. Чвэрць з названай лічбы — пасажыры, перавезеныя кампаніяй транзітам. Занятасць сядзенняў у самалётах кампаніі дасягнула амаль 70%. З усіх самалётаў кампаніі 89,6% узняліся ў паветра з адставаннем ад графіку не больш чым 15 хвілін. Гэта даволі высокі паказчык у параўнанні з іншымі замежнымі перавозчыкамі. Як вынік, Рыжскі міжнародны аэрапорт прызнаў «Белавію» самай пунктуальнай кампаніяй, якая выконвае рэйсы ў сталіцу Латвіі, а маскоўскі «Дамадзедава» — адной з самых пунктуальных.

Сёлета пасажыры «Белавіі» маглі набыць квіток на самалёт і праз інтэрнэт. Плануецца ў бліжэйшым будучым рэалізаваць магчымасць замовы білетаў з дапамогай планшэтаў і смартфонаў. Для бортправаднікоў была распрацавана новая форма, прычым у двух варыянтах — летнім і зімнім.

Што датычыць авіяпарка, то сёлета кампанія набыла два новыя бразільскія самалёты Embraer 175, якія адразу сталі флагманамі айчыннага паветранага флоту. Пачалося таксама абнаўленне салонаў старых самалётаў.

Сёлета «Белавія» плануе набыць яшчэ некалькі суднаў. Пачнуць працаваць два новыя рэйсы — на Кутаісі і Самару. З'явяцца і рэйсы з абласных цэнтраў: Гомеля, Гродна, Брэста. Час знаходжання пасажыра ў зоне транзіту будзе змяншацца за кошт адмовы ад паўторнага праходжання праверкі багажу ў прысутнасці пасажыра. Набыць тавары duty-free можна будзе ў салоне самалёта, аднак дзеля гэтага патрэбны змены ў заканадаўстве.

Кампанія зменіцца не толькі ўнутрана, але і знешне: якраз зараз «Белавія» шчыльна займаецца пытаннем распрацоўкі новага брэнда. Ігар Чаргінец не выключыў магчымасці, што беларускія самалёты будуць перафарбаваны ў колеры нацыянальнага сцяга ці на іх будзе нанесены беларускі арнамент. Спадар Чаргінец таксама паведаміў, што часам пасажыры «Белавіі» наракаюць на нядобразычлівасць супрацоўнікаў кампаніі. Гэтая праблема будзе вырашацца шляхам правядзення псіхалагічных трэнінгаў для работнікаў «Белавія», а ў некаторых выпадках — і звальненнем апошніх. Усе тыя ж трэнінгі павінны навучыць бортправаднікоў часцей усміхацца пасажырам. На жаль, нават такая дробязь з'яўляецца вельмі істотнай у працы авіяперавозчыкаў.

Зараз «Белавія» паступова пераходзіць з класічнага тыпу авіякампаніі на гібрыдны. Гэта значыць, што на некаторыя рэйсы можна набыць так званыя «лоўкосты» — вельмі танныя квіткі. На такіх самалётах амаль адсутнічае традыцыйны авіясэрвіс. Пасажыр плаціць толькі за сам пералёт. Паступова колькасць такіх рэйсаў будзе павялічвацца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

УДЗЕНЬ З ПЛЮСАМ І МОКРЫ СНЕГ, А ЎНАЧЫ ПАДМАРОЗІЦЬ

У першы дзень лютага надвор'е ў нашай краіне будуць вызначаць атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы і вільготныя няўстойлівыя паветраныя масы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У суботу надвор'е істотна пагоршыцца, бо праз тэрыторыю Беларусі будзе рухацца сур'ёзны цыклон з боку Польшчы. У ноч на 2 лютага месцамі кароткачасовы снег, а ўдзень снегапады будуць назірацца ўжо паўсюдна. Па паўднёвым захадзе прагназуецца мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж; месцамі моцны мокры снег, наліпанне мокрага снегу і галалёдныя з'явы.

Калі ўдзень будзе суцэльная хлюпота, то ў ноч на суботу падмарозіць да мінус 3—10 градусаў, а на паўночным усходзе чакаецца панізжэнне тэмпературы ажно да 13 марозу. Удзень будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. Цяплей будзе ў суботу толькі ў Брэсцкай вобласці. Там уначы каля 0, а ўдзень — 3—5 цяпла.

Паўсюдна будзе ісці снег і ў нядзелю. Па паўночным усходзе месцамі моцныя снегапады. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 6 градусаў па поўначы да плюс 1 градуса на поўдні Беларусі.

Паводле папярэдніх прагнозаў, і ў пачатку наступнага тыдня ў многіх раёнах будзе ісці кароткачасовы снег. На дарогах месцамі слізка. У ноч на панядзелак чакаецца мінус 3—10, пры праясненнях — да 13 марозу, удзень — ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. Такое надвор'е, што бедны наш абутак...

Сяргей КУРКАЧ.

■ Прамая лінія

АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ЖЫЛЛЁВАЙ ПАЛІТЫКІ

Сёння з 11.00 да 13.00 у рэдакцыі нашай газеты адбудзецца «прамая лінія» з удзелам начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандра Вітальевіча ГОРВАЛЯ. Начальнік упраўлення адкажа на пытанні рэгулявання сістэмы пастаноўкі на ўлік грамадзян з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, пра новыя механізмы дзяржаўнай падтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве, пра будаўніцтва жылля па дзяржзаказе і арэнднага жылля, а таксама на іншыя актуальныя пытанні жыллёвай палітыкі. Нумары «прамой лініі»: **8 (017) 292 38 92, 8 (017) 292 38 21.** Папярэднія пытанні можна дасылаць на электронны адрас: zvarot@zvyazda.minsk.by.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У КНДР УВЕДЗЕНА ВАЕННАЕ СТАНОВІШЧА

Лідар Паўночнай Карэі Кім Чэн Ын аддаў сакрэтны загад завяршыць падрыхтоўку да ядзерных выпрабаванняў і правесці іх у бліжэйшы час. Таксама, згодна з іншым загадам лідара КНДР, з 29 студзеня ў краіне ўведзена ваеннае становішча. Як лічаць эксперты, ядзерныя выпрабаванні пройдуць 16 лютага — у дзень нараджэння былога лідара КНДР Кім Чэн Іра. Таксама магчымая дата 25 лютага — гэта дзень інаўгурацыі прэзідэнта Паўднёвай Карэі Пак Кын Хе. Амерыканскія даследчыкі ўжо не раз казалі, што КНДР цалкам гатова да ажыццяўлення трэцяй, завяршальнай, стадыі падземных ядзерных выпрабаванняў. Першыя спробы былі здзейснены ў 2006 годзе, другія — трыма гадамі пазней.

ПРАВААБАРОНЦЫ АБВІНАВАЦІЛІ ЗША Ў КРЫВАДУШНАСЦІ

Міжнародная праваабарончая арганізацыя Human Rights Watch (HRW) лічыць, што ЗША крывадушнічаюць, прасоўваючы правы чалавека ў іншых краінах, не разабраўшыся са сваімі ўласнымі праблемамі.

«Усім дзяржавам, тым больш тым, якія прасоўваюць правы чалавека ў іншых краінах, неабходна прывесці ў парадак іх уласныя справы. Напрыклад, адміністрацыя Абамы адмаўляецца даваць ход крымінальнаму расследаванню спраў чыноўнікаў з адміністрацыі Буша-малодшага, якія мелі дачыненне да ўжывання катаванняў», — сказала намеснік дырэктара дэпартамента па Еўропе і Цэнтральнай Азіі Human Rights Watch Рэйчэл Дэнбер. HRW прадставіла даклад на 665 старонак, у якім ацэньваецца сітуацыя з правамі чалавека больш чым у 90 краінах свету.

РЭФОРМА ПРЫВЯЛА ДА ПАДЗЕННЯ БАЯВОГА ДУХУ

Рэформа нямецкай арміі, якая працягваецца ўжо некалькі гадоў, прывяла да падзення баявога духу салдат. Да такой несуцяшальнай высновы прыйшоў упаўнаважаны па справах бундэсвера Хельмут Кенігсхаус. Міністэрства абароны пасля адмены ў 2011 годзе прызыву ўсімі сіламі спрабавала ператварыць войска ў прывабнае месца працы для радавога немца, але поспехі пакуль даволі сумнеўныя. З тых часоў як у войска ператалі ў абавязковым парадку заклікаць усіх маладых людзей, немцы пачалі ставіцца да ваеннай службы гэтак жа, як да грамадзянскай прафесіі, — і скардзіцца на адсутнасць камфорту.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У ЧЫЛІ ВЫНАЙШЛІ ВАКЦЫНУ СУПРАЦЬ АЛКАГАЛІЗМУ

Навукоўцы з чылійскага ўніверсітэта прапанавалі рашэнне праблемы алкагалізму ў краіне. Спецыялісты стварылі вакцыну, якая здольная выклікаць у чалавека вельмі цяжкае пахмелле пасля любой колькасці прынятага алкаголю.

Дзеянне такіх «лекаў», над стварэннем якіх даследчыкі працавалі цэлы год, цягнецца ад 6 да 12 месяцаў. Актыўны кампанент прыпыняе ў печані выпрацоўку ферменту, які спрыяе перапрацоўцы алкаголю. У выніку пацыент адчувае моцнае пачуццё дыскамфорту, прыступ млоснасці і паскоранае сэрцабіцце. Спосабаў адмяніць дзеянне вакцыны пакуль няма. Выпрабаванне вакцыны на мышах запланавана на люты, а ў лістападзе эксперыменты пройдуць ужо на добраахвотніках. Паводле слоў спецыяліста, ідэя стварэння вакцыны прыйшла да яго пасля таго, як ён і яго калегі вывучылі рэакцыю на алкаголь японцаў, кітайцаў і карэйцаў. Вядома, што ў 15—20% прадстаўнікоў азіяцкай расы згублены ген, які адказвае за «ператраўліванне» алкаголю ў арганізме.

КАРАТКА

Продаж білетаў на матчы чэмпіянату свету па хакей 2014 года ў Мінску плануецца пачаць у жніўні-верасні бягучага года. Білетная праграма распрацавана сумесна з білетным аператарам «Тикетпро». Сярэдні кошт квітка складзе 26,3 еўра — ад 6 еўра на матчы папярэдняга этапу да 250 еўра на фінальную частку турніру.

Чацвёрты транш на $440 млн. крэдыту Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС паступіў у Беларусь. Транш залічаны на рахунак Міністэрства фінансаў у Нацыянальным банку і будзе накіраваны на папаўненне міжнародных рэзервовых актываў Беларусі.

Паступленні ў бюджэт Беларусі ад падатку на нерухомую маёмасць у 2012 годзе павялічыліся на 21 працэнт. У мясцовыя бюджэты ў 2012 годзе паступіла амаль Br3,4 трлн. падатку на нерухомую маёмасць, што ў супастаўных цэнах складае 121,1 працэнта да папярэдняга года. Найбольшая доля паступленняў прыпадае на арганізацыі.

Падпарадкаваныя Мінтрансу Беларусі прадпрыемствы авіяцыйнай галіны ў 2012 годзе павялічылі экспарт паслуг на 14,7 працэнта ў параўнанні з 2011 годам да $279,5 млн.

ЦІ ДАЎНО ВЫ ЧЫТАЛІ ВЕРШЫ?

Міхаіл МАЦЭЛЬ, намеснік старшыні Нясвіжскага райвыканкама:

— Я больш люблю іх слухаць (*усміхаецца*). І вершы, і песні... Ды і сам магу заспяваць. А калі чытаць, аддаю перавагу прозе. Мне вельмі падабаецца Ільф і Пятроў, малыя апавяданні Чэхава, якія я лічу актуальнымі і сёння, люблю «Маскву і масквічоў» Гіляроўскага. Я ўжо не кажу пра такіх класікаў, як Леў Талстой. Хаця... у маладосці мне вельмі падабаўся Уладзімір Высоцкі.

Алена ВОТЧЫЦАВА, намеснік дырэктара мінскага кінатэатра «Кастрычнік»:

— Нядаўна чытала. Я, напэўна, у юнацтве нават радзей звярталася да паэзіі, чым цяпер. А сёння ва ўсіх нас занадта высокі тэмп жыцця, занадта шмат стасункаў, часам праблемных... Пасля ўсяго гэтага хочацца адпачыць душой. Вось так і атрымалася, што з узростам я стала часцей гартаць томік вершаў. Вельмі люблю Сяргея Астравога, Роберта Раждественскага. Ну і Пушкіна, натуральна — бо гэта наша ўсё! Яго наогул цытуеш часам міжволі. Ідзеш зімой па парку, і як не ўспомніць яго класічныя радкі? Яны проста аўтаматычна ўсплываюць у памяці!

Таццяна ГАПОН, настаўнік фізкультуры Навасёлкаўскай сярэдняй школы Нясвіжскага раёна:

— Калі шчыра, то даўно. Часам, калі сяджу ў інтэрнэце і бачу які-небудзь любоўны верш, то магу прачытаць. Але асабліва паэзіяй не захапляюся. А вось мая сяброўка, якая працуе настаўніцай пачатковых класаў, нават сама піша вершы. Часам устане сярод ночы і запісвае. І вершы ў яе прыгожыя. Аднойчы яна нават чытала іх на канферэнцыі ў бібліятэцы.

Святлана БУСЬКО.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ISSN 1990 - 763X

...ЗАВЯРШЫЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ЗАКОНАПРАЕКТА АБ ЗМЯНЕННЯХ У ВЫБАРЧЫ КОДЭКС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нарада па сутнасці стала дыскусіяй аб перспектывах развіцця выбарчага заканадаўства, на якой абмяркоўваліся прапановы Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў і рэкамендацыі экспертаў міжнародных інстытутаў, у тым ліку АБСЕ.

Акрамя старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай свае погляды на абмяркоўваемыя пытанні прадставілі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кабякоў, міністр замежных спраў Уладзімір Макей, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка, дзяржсакратар Савета Бяспекі Леанід Мальцаў, губернатар Мінскай вобласці Барыс Батура і іншыя ўдзельнікі нарады. Напярэдадні сустрэчы ў Прэзідэнта ўдасканаленне выбарчага заканадаўства ўжо абмяркоўвалася прыкладна ў тым жа складзе, аднак на многіх пытаннях адзінай пазіцыі выпрацаваць не ўдалося, а таму дыскусія была вынесена на ўзровень кіраўніка дзяржавы.

Усе прапановы па ўдасканаленні выбарчага заканадаўства былі прадметна абмеркаваны, і ўдзельнікі сустрэчы сышліся на думцы аб неабходнасці дадатковай прапрацоўкі некаторых пытанняў і падрыхтоўкі пакета дакументаў, галоўным з якіх стане праект закона аб унясенні змяненняў у Выбарчы кодэкс Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Адміністрацыі Прэзідэнта выпрацаваць узгодненыя прапановы з улікам выніка ў нарады і папрасіў кіраўнікоў парламента актыўна падключыцца да гэтага працэсу. Падрыхтоўка адпаведнага законапраекта павінна быць завершана ў маі гэтага года, пасля чаго ён будзе прадстаўлены кіраўніку дзяржавы для ўнясення ў парламент.

«Мы не ставім сёння за мэту штосьці змяніць. Мы вядзём дыскусію аб удасканаленні заканадаўства. Гэта, дарэчы, тое, што я абяцаў пасля апошніх выбараў. Мы паглядзім прапановы, і калі гэта нам падыходзіць сёння — мы прымем, не — значыць, не прымем. Ёсць прапановы, з якімі можна згадзіцца, можа, з'явіцца новыя», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыла па выніках нарады Лідзія Ярмошына, дакумент павінен максімальна ўлічваць як нацыянальныя інтарэсы, так і міжнародныя стандарты.

З канцэптуальных пытанняў, вынесеных на абмеркаванне, большасцю ўдзельнікаў нарады не была падтрымана ініцыятыва аб прадастаўленні рэспубліканскім грамадскім арганізацыям права вылучаць кандыдатаў у дэпутаты. На думку кіраўніка ЦВК, адмова ад гэтай ідэі ў тым ліку задаволіць палітычных апанентаў, якія актыўна выступалі супраць гэтага новаўвядзення.

Іншыя ініцыятывы ЦВК у цэлым атрымалі падтрымку. Гэта, у прыватнасці, датычыцца пераходу да прынцыпу адноснай большасці на парламенцкіх выбарах у першым туры. Гэта дасць магчымасць спрасціць выбарчую кампанію і скараціць расходы.

Абмеркавана таксама прапанова па павелічэнні асабістых выбарчых фондаў кандыдатаў і дазволу ўтварэння такіх фондаў для кандыдатаў у дэпутаты мясцовага ўзроўню.

Шэраг прапаноў быў звязаны з увядзеннем некаторых папераджальных мер у перадвыбарную агітацыю, у тым ліку прымяняльна да працэдуры байкоту. Удзельнікі нарады згадзіліся з прапановамі ЦВК аб тым, што гэта дзейнасць, накіраваная на зрыў выбараў, павінна быць выведзена з выбарчага заканадаўства і з перадвыбарнай дзейнасці як такой і весціся асобна, але не кандыдатамі ў дэпутаты. Знамянальна, што, напрыклад, у Канвенцыі аб стандартах дэмакратычных выбараў, выбарчых правоў і свабод у дзяржавах — удзельніцах СНД змешчана спасылка на забарону байкоту выбараў.

Падтрымана таксама прапанова аб тым, каб выраб лістовак і плакатаў кандыдатамі аплачваўся за кошт асабістых сродкаў, а не бюджэту. Вызваленыя рэсурсы прапануецца перадаць выбаркамам для больш шырокага інфармавання выбаршчыкаў аб кандыдатах. Гэта звязана са скаргамі грамадзян аб недастатковым аб'ёме інфармацыі напярэдадні выбараў.

Акрамя таго, магчымы змяненні ў правілах правядзення мясцовых выбараў у частцы ўзроўню Саветаў дэпутатаў, для чаго спатрэбіцца карэкціроўка некаторых заканадаўчых актаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДЗЕЙНАСЦЬ КС БЕЛАРУСІ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ КАНСТЫТУЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ СТАНЕ БОЛЬШ ВЫНІКОВАЙ

Аб гэтым падчас рабочай сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам праінфармаваў старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч.

Як праінфармавалі ў прэс-службе, на сустрэчы была звернута ўвага, што для павышэння эфектыўнасці ўздзеяння права ў розных сферах неабходна ўзмацніць канстытуцыйны кантроль над нарматворчасцю.

Чакаецца, што ў бліжэйшы час парламентам будзе прыняты законапраект аб канстытуцыйным судаводстве, унесены Прэзідэнтам. Дзякуючы новай працэсуальнай аснове дзейнасць Канстытуцыйнага Суда па зацвярджэнні канстытуцыйнай законнасці нарматворчасці і правапрымянення стане больш выніковай.

Як адзначылі ў прэс-службе Прэзідэнта, падчас сустрэчы кіраўнік дзяржавы станоўча ацаніў дзейнасць Канстытуцыйнага Суда па ўмацаванні канстытуцыйнай законнасці ў 2012 годзе.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Канстытуцыйнаму Суду неабходна ўзяць на кантроль выкананне Паслання Канстытуцыйнага Суда Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, Палаце прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі Нацыянальнага сходу «Аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь у 2012 годзе». «Вы прадставілі дакумент аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Беларусі ў 2012 годзе. Я яго накіраваў з адпаведнай рэзалюцыяй усім для выканання. Вазьміце гэта на кантроль. Інфармуйце мяне аб выкананні дзяржаўных прапаноў, якія выкладзены ў вашым дакументе. Гэта асноўнае», — сказаў Прэзідэнт.

«Калі, напрыклад, урад, суды і іншыя органы ўлады на выяўленыя недахопы не рэагуюць, то, напэўна, трэба мяне падключаць да гэтага працэсу, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Гэта недапушчальна, калі Канстытуцыйны Суд у такой, можна сказаць, мяккай форме прапануе адрэагаваць на недахопы, а меры не прымаюцца».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся таксама якасцю законапраектаў, якія прымае парламент: «Якая сітуацыя з законамі, як, з вашага пункту гледжання, працуе парламент, як вы наогул ацэньваеце яго патэнцыял?»

Як адзначыў Пётр Міклашэвіч, у парадку папярэдняга канстытуцыйнага кантролю КС праверыў усе законы, прынятыя парламентам. Усе яны былі прызнаны адпаведнымі нормам і прынцыпам Канстытуцыі.

Кіраўнік дзяржавы таксама быў праінфармаваны аб міжнародным супрацоўніцтве КС з аналагічнымі органамі іншых краін, з Венецыянскай камісіяй Савета Еўропы, было ўзгоднена пытанне аб дэлегаванні ў якасці прадстаўніка Беларусі ў гэту камісію намесніка старшыні Канстытуцыйнага Суда Вольгі Сяргеевай.

На сустрэчы таксама былі ўзгоднены некаторыя арганізацыйныя пытанні да 20-гадовага юбілею КС, які будзе адзначацца ў 2014 годзе. У сувязі з гэтым Канстытуцыйны Суд мае намер правесці міжнародны форум з удзелам сваіх калег з еўрапейскіх краін, постсавецкай прасторы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПЕРШЫЯ ЛЕГКАВЫЯ АЎТАМАБІЛІ БЕЛАРУСКА-КІТАЙСКАЙ ЗБОРКІ ПАСТУПЯЦЬ У ПРОДАЖ У ЛЮТЫМ

Аб гэтым паведаміў учора міністр прамысловасці Дзмітрый Кацярыніч, перадае БЕЛТА.

«Пасля падпісання акта ўводу магутнасцяў, я спадзяюся, што ўжо ў лютым першыя аўтамабілі паступяць у продаж у Беларусі, — сказаў Дзмітрый Кацярыніч. — А ў сярэдзіне года можна чакаць, што яны паступяць і ў Расійскую Федэрацыю. Цана аўтамабіля сярэдняга класа тыпу седан арыенціровачна складзе $12 тыс. 990».

Міністр адзначыў, што з кітайскімі партнёрамі цяпер рэалізуецца праект па сумеснай вытворчасці легкавых аўтамабіляў. Створана сумеснае прадпрыемства «БелДжы». Партнёрамі па праекце з'яўляюцца ААТ «БелАЗ», які мае 50 працэнтаў акцый у гэтым СП, і кітайская кампанія «Джылі» (32,5 працэнта акцый).

Дзмітрый Кацярыніч таксама растлумачыў, чаму Мінпрам вырашыў супрацоўнічаць менавіта з кітайскай кампаніяй «Джылі». «Гэта маладая кампанія набыла пакет акцый і завод «Вольва» па вытворчасці легкавых аўтамабіляў, — канстатаваў міністр. — А «Вольва», як вядома, славіцца сваёй якасцю і бяспекай, таму гэта важна для нас. Усё лепшае, што ёсць у «Вольва», безумоўна, пераносіцца і на наш аўтамабіль». У Беларусі праведзены ўжо выпрабаванні аўтамабіля тыпу седан сярэдняга класа. У наступным месяцы маем намер сабраць аўтамабілі і правесці выпрабаванні тыпу красовераў, а таксама невялікія аўтамабілі з малым расходам паліва тыпу хэтчбэк.

Сабраны ў Беларусі легкавы аўтамабіль з кітайскіх машынакамплектаў будзе канкурэнтаздольным не толькі на ўнутраным рынку, але і на рынку Мытнага саюза, лічыць Дзмітрый Кацярыніч. Міністр удакладніў, што кітайская кампанія «Джылі», з якой рэалізуецца сумесны праект па зборцы ў Беларусі легкавых аўтамабіляў, таксама прадае свае машыны на расійскім рынку. Цяпер, калі Расія прыняла рашэнне аб увядзенні ўтылізацыйнага збору на аўтамабілі, цэны на ўвоз як новых, так і былых ва ўжыванні машын на рынку Мытнага саюза ўзраслі. У сувязі з гэтым беларуска-кітайскі праект па зборцы легкавых аўтамабіляў дае магчымасць выпускаць на рынак Мытнага саюза канкурэнтаздольны па цане аўтамабіль. Дзмітрый Кацярыніч растлумачыў, што пры рэалізацыі сабранай у Беларусі прадукцыі не выплачваецца ўтылізацыйны збор. Гэта адна з выгад, якую дае праект. Акрамя таго, на аўтакампаненты, што выкарыстоўваюцца для вытворчасці гэтых аўтамабіляў, не будуць выплачвацца мытныя пошліны. «Таму аўтамабіль будзе канкурэнтаздольным не толькі на нашым рынку, але і ў Расіі і Казахстане», — падкрэсліў міністр.

Рэалізацыя першых сабраных у Беларусі кітайскіх аўтамабіляў будзе ажыццяўляцца праз сетку Мінпрама. Ужо выбрана такое прадпрыемства па рэалізацыі ў Мінску, яно знаходзіцца на вуліцы Казлова. Паводле слоў міністра, на новую прадукцыю паступіла ўжо шмат заявак.

СЕМ ПРОСЬБАЎ ЭНЕРГЕТЫКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Намеснік міністра паказаў дэпутатам графік павышэння кошту газу для энергетыкаў, які відавочна дэманструе значнае апярэджанне тэмпаў росту тарыфаў на электраэнергію для насельніцтва. «Падчас дэвальвацыі 90% сабекошту электраэнергіі складала паліва, — заўважыў Міхаіл Міхадзюк. — Гэта значыць, што энергетыкі ўзялі на сябе асноўны ўдар. Каб дазволіць дыхаць эканоміцы краіны, мы максімальна скарацілі выдаткі на рамонт і іншае. Пры гэтым у доларавым эквіваленце цана на электрычнасць для насельніцтва знізілася».

Аднак «нажніцы» цэн на паліва для энергетыкаў і тарыфаў для насельніцтва выклікалі незбалансаванасць дзейнасці энергасістэмы. Па-першае, гэта абумовіла невысокія заробкі. Аднак у гэтай галіне, падкрэсліваюць яе прадстаўнікі, павінны працаваць не проста высокакваліфікаваныя спецыялісты, але людзі асаблівага складу — з высокай ступенню адказнасці. Ад іх кампетэнцыі, рэакцыі, увагі, стрэсаўстойлівасці і дысцыпліны залежыць забеспячэнне жыццядзейнасці прамысловых зон і жылых раёнаў.

Па-другое, энергетыкам даводзіцца эканоміць на рамонтна-эксплуатацыйным абслугоўванні. За апошнія 3 гады выдаткі на гэтыя работы былі скарочаны ўдвая. Галоўныя інжынеры, якія адказваюць за надзейнасць і бяспеку энергетычнага абсталявання, кажуць, што без укладання грошай, аднымі арганізацыйнымі мерапрыемствамі, яны не ў стане выконваць свае абавязкі.

— Пераход да дыферэнцаваных тарыфаў — крок да сацыяльнай справядлівасці, — выказаў агульную думку ўсіх кіраўнікоў паліўна-энергетычнай галіны **генеральны дырэктар Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белэнерга» Аляксей ШЫРМА**. — Да гэтага часу атрымлівалася так, што той, хто мае 5 тэлевізараў, электрападагрэў падлогі, некалькі халадзільнікаў, электраабагравание і лядоўню, атрымлівае большую датацыю ад дзяржавы, чым той, хто жыве больш сціпла і мае стандартны набор бытавых даброт.

Два гады «Белэнерга» шукала найбольш справядлівы спосаб налічэння дыферэнцаваных тарыфаў. Разглядалася прапанова ўвесці падушнае нармаванне, але аказалася, што ў Беларусі няма глабальнай сістэмы замацавання чалавека па месцы жыхарства. Акрамя таго, у краіне штогод адбываецца каля 400 тысяч змен у статыстыцы пражывання. Тады энергетыкі вырашылі ўсталяваць нормы для абанентаў (на кожны электралічыльнік). У Беларусі 4 млн 200 тысяч бытавых абанентаў. З іх большасць мае газавыя пліты. У норму 150 кВт.г укладаюцца 77,3% абанентаў. Аднак яны выкарыстоўваюць толькі палову ўсяго аб'ёму спажывання электраэнергіі. Звыш за 300 кВт.г у месяц накручваюць лічыльнікі ў 3% абанентаў, якія спажываюць амаль 13% усяго аб'ёму электраэнергіі. Падобныя лічбы і па абанентах, якія карыстаюцца на кухні электрычнымі плітамі. Такім чынам, для большасці насельніцтва ў сістэме аплаты за электрычнасць нічога не зменіцца, лічаць энергетыкі.

Нават пры пераплаце грошы атрымліваюцца не надта вялікія, пераконвалі распрацоўшчыкі дыфтарыфаў. Адзін з чыноўнікаў прывёў у прыклад свой прыватны дом, які абслугоўваюць дзве электрапомпы. За студзень ён выкарыстаў каля 500 кВт.г, па новых тарыфах і правілах яму прыйдзецца заплаціць 300 тысяч рублёў. Нават пры пенсіі ў 2 мільёны гэта прымальныя грошы, лічыць чыноўнік. Тым больш што летам электраэнергіі для абслугоўвання прыватнага дома спатрэбіцца менш.

Павышэнне тарыфаў на электраэнергію на 18% і ўвядзенне дыферэнцаваных тарыфаў, між тым, не вырашыць праблему дэфіцыту сродкаў у энергетычнай сістэме. Таму крокі па ліквідацыі перакрыжаванага субсідавання трэба працягваць, настойваюць яе прадстаўнікі.

У норму 150 кВт.г укладаюцца 77,3% абанентаў. Аднак яны выкарыстоўваюць толькі палову ўсяго аб'ёму спажывання электраэнергіі. Звыш за 300 кВт.г у месяц накручваюць лічыльнікі ў 3% абанентаў, якія спажываюць амаль 13% усяго аб'ёму электраэнергіі. Падобныя лічбы і па абанентах, якія карыстаюцца на кухні электрычнымі плітамі. Такім чынам, для большасці насельніцтва ў сістэме аплаты за электрычнасць нічога не зменіцца, лічаць энергетыкі.

Просьба 3:
АДЗІНЫЯ ТАРЫФЫ НА ГАЗ

Дыферэнцаваныя тарыфы на газ будуць прымяняцца для тых абанентаў, якія выкарыстоўваюць блакітнае паліва для ацяплення, такіх кватэр у Беларусі 530 тысяч.

Абаненты, якія выкарысталі да 3 тысяч куб.м газу за год, будуць аплачваць па адзінарным тарыфе (348 рублёў за куб.м). Тыя, хто спаліў больш за 3 тыс. куб. м газу, але менш за 5,5 тысячы, па-за лімітную колькасць газу будуць аплачваць па тарыфе з прымяненнем павышальнага каэфіцыента 1,3. Калі гадавое спажыванне перавысіла 5,5 тысяч куб.м, плаціць за перавышаны аб'ём давядзецца па сабекошце выдаткаў на аказаную паслугу — 2 095 рублёў за куб.м. Гэта ў 7 разоў больш за базавы тарыф.

— Па нашых падліках, 75% беларусаў не перавышаюць гадавы аб'ём у 3 тысячы кубічных метраў. Асноўная маса людзей, якія пражываюць у дамах да 150 кв.м. будуць укладацца ў гэтыя межы, — паведаміў **генеральны дырэктар Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белпалівагаз» Леанід РУДЗІНСКІ**. — Я і сам жыву ў доме, дзе 260 кв. м. ацяпляецца газам. У 2010 годзе выкарыстаў самы вялікі аб'ём газу — 4 800 куб.м. У гэтым выпадку мая пераплата складае 70 тысяч рублёў за год. Гэта, пагадзіцеся, няшмат. Праўда, трэба сказаць, што мой дом уцеплены.

Калі дом не ўцеплены, то лічбы могуць адрозніваццца. Другі прыклад, які прагучаў на пасяджэнні, датычыўся іншага фаў (348 тысяч рублёў).

«Трэба ўсталяваць адзіны тарыф», — папрасілі вытворцы дэпутатаў. І папярэдзілі, што найбольш скаргаў з нагоды дыферэнцаваных тарыфаў будзе менавіта ад тых, хто ацапляе газам вялікія плошчы, мае вялікія і дрэнна ўцепленыя дамы.

Просьба 4:
ПРАЛІЧЫЦЬ НА КРОК НАПЕРАД

На кожны кіламетр газаправода, які сёлета будуе аб'яднанне «Белпалівагаз» (а яно штогод пракладае каля 2,5 тысячы км труб), на наступны год неабходна будзе знайсці $2000, каб забяспечыць якасную яго эксплуатацыю. Кожная газіфікаваная кватэра (у сярэднім аб'яднанне газіфікуе прыродным газам каля 25-32 тысяч кватэр штогод) прыносіць страты аб'яднанню «Белпалівагаз» у сярэднім $300 у год. Тут таксама трэба шукаць выйсце, заклікалі газаўшчыкі. «Газіфікацыю мы скончылі, цяпер важна абараніць эканоміку дзяржавы», — гучала папярэджанне на выязным пасяджэнні дэпутацкай камісіі.

Адваротны бок «нажніц» цэн на паліва для энергетыкаў і тарыфаў для насельніцтва — незбалансаванасць дзейнасці энергасістэмы.

мі па-ранейшаму ў камфортных умовах, але цеплавой і электрычнай энергіі для гэтага выдаткоўваем значна менш, тлумачылі яны розніцу.

— Мы дастаткова доўга працавалі над праектам закона «Аб электраэнергетыцы», — расказаў дэпутатам пра другі закон Аляксей Шырма. — Ёсць і тэкст канцэпцыі закона, дастаткова ўзважанага і збалансаванага. Асноўная мэта — усталяванне правіл гульні і размежаванне поля айчыннай энергетыкі: хто чым павінен займацца, хто за што несці адказнасць і хто чым павінен рэгуляваць. Мы з задавальненнем перададзім гэтыя напрацоўкі ў камісію. Закон добры тым, што можа быць прыменены як да той сітуацыі ў энергетыцы, якая існуе зараз, так і ў выпадку, калі яе цалкам рэструктурызаваць.

Праўда, на рэструктурызацыю сваёй галіны самі энергетыкі глядзяць скептычна, бо вопыт суседзяў паказвае, што ўслед за раздраблennем і вылучэннем па сферы дзейнасці, зноў адбываецца аб'яднанне і цэнтралізацыя.

Просьба 7:
ДАЗВОЛІЦЬ ДВАЙНОЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ ЗЯМЛІ

«Нас справядліва крытыкуюць за частае адключэнне ў электрычных сетках, — прызнаўся дэпутатам Аляксей Шырма. — Па часе на ліквідацыю пашкоджанняў мы знаходзімся на еўрапейскім узроўні, не горш за Фінляндыю і Швецыю. Аднак прэтэнзіі застаюцца. Апошняя найбольш рэзанансная аварыя адбылася ў Беразіно».

Адна з магчымасцяў зменшыць колькасць пашкоджанняў ліній электрапередач — пашырэнне лясных просек. Лініі электрапередач цягнуцца ў Беларусі на 270 тысяч кіламетраў, з іх 32 тысячы — гэта лініі высокага напружання. Калі для ліній нізкага напружання праблема можа быць вырашана з дапамогай ізаляванага праводу, то для высакавольтных — толькі праз пашырэнне просекі, і пашырэнне досыць шырокае — да 60 метраў.

— Гэта адразу нараджае праблему адводу зямлі, — тлумачыць кіраўнік «Белэнерга». — Калі зямля адведзена энергетыкам для эксплуатацыі лініі электрапередачы, то, згодна з дзейным заканадаўствам, нічога іншага на ёй рабіць нельга. Пры гэтым энергетыкі павінны плаціць мясцовым Саветам высокі зямельны падатак.

На гэтых землях можна было б нешта арганізаваць: пракласці дарогі, выкарыстаць для сельскай гаспадаркі (вышыня лініі ў 4 метры дазваляе), пасадзіць дрэвы для атрымання мясцовага паліва. Але гэтым павінны займацца іншыя юрыдычныя асобы, якія не ўваходзяць у сістэму энергетыкі, а гэта забаронена законам.

— Калі б заканадаўства дазволіла двайное выкарыстанне гэтых зямель, нам удалося б вырашыць задачу павышэння надзейнасці ліній электрапередач, заплаціць падаткі мясцовым Саветам, акрамя таго, землі могуць прыносіць прыбытак, — лічаць энергетыкі.

У сваю чаргу **старшыня Пастаяннай камісіі Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК** запэўніў энергетыкаў, што іх праблемы зразумелыя для дэпутатаў камісіі, якія ўсе прыйшлі з рэальнага сектара эканомікі. «Сёння ў нашай камісіі знаходзіцца на прапрацоўцы 7 законапраектаў, з іх тры ўяўляюць найбольшы інтарэс для вашага сектара, — сказаў ён. — Асноўная наша мэта — наладзіць нармальныя, рабочыя стасункі з тымі, для каго мы гэтыя законы прымаем. Даведацца аб праблемах, намеціць шляхі іх вырашэння і разам вырашаць».

Старшыня камісіі таксама падтрымаў ідэю сумеснай работы над праектам закона «Аб электраэнергетыцы».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота аўтара.

Генеральны дырэктар «Мінскэнерга» Яўген ВОРАНАЎ (злева) і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК разам з іншымі дэпутатамі наведалі адзін з карпусоў Мінскай ТЭЦ-3, абсталяванне ў якім хутка будзе цалкам заменена на сучаснае.

**Дом, дзе 260 кв. м, ацяпляецца газам.
У 2010 годзе выкарыстана 4 800 куб.м.
У гэтым выпадку пераплата складала 70 тысяч за год.
Гэта, пагадзіцеся, няшмат. Праўда, трэба сказаць, што дом уцеплены.**

Просьбы 5 і 6:
АДЗІН ЗАКОН ПЕРАЙМЕНАВАЦЬ, ДРУГІ ПРЫНЯЦЬ

Зараз у Палаце прадстаўнікоў да другога чытання рыхтуецца праект закона «Аб энергазберажэнні». На выязным пасяджэнні энергетыкі сказалі, што ён сыры, ні да чаго не стымулюе, і прапанавалі перайменаваць у закон «Аб энергаэфектыўнасці».

Энергазберажэнне — гэта эканомія, а энергаэфектыўнасць — гэта калі мы знаходзімся з вацыю сваёй галіны самі энергетыкі глядзяць скептычна, бо вопыт суседзяў паказвае, што ўслед за раздраблennем і вылучэннем па сферы дзейнасці, зноў адбываецца аб'яднанне і цэнтралізацыя.

Просьба 7:
ДАЗВОЛІЦЬ ДВАЙНОЕ ПРЫЗНАЧЭННЕ ЗЯМЛІ

«Нас справядліва крытыкуюць за частае адключэнне ў электрычных сетках, — прызнаўся дэпутатам Аляксей Шырма. — Па часе на ліквідацыю пашкоджанняў мы знаходзімся на еўрапейскім узроўні, не горш за Фінляндыю і Швецыю. Аднак прэтэнзіі застаюцца. Апошняя найбольш рэзанансная аварыя адбылася ў Беразіно».

Адна з магчымасцяў зменшыць колькасць пашкоджанняў ліній электрапередач — пашырэнне лясных просек. Лініі электрапередач цягнуцца ў Беларусі на 270 тысяч кіламетраў, з іх 32 тысячы — гэта лініі высокага напружання. Калі для ліній нізкага напружання праблема можа быць вырашана з дапамогай ізаляванага праводу, то для высакавольтных — толькі праз пашырэнне просекі, і пашырэнне досыць шырокае — да 60 метраў.

— Гэта адразу нараджае праблему адводу зямлі, — тлумачыць кіраўнік «Белэнерга». — Калі зямля адведзена энергетыкам для эксплуатацыі лініі электрапередачы, то, згодна з дзейным заканадаўствам, нічога іншага на ёй рабіць нельга. Пры гэтым энергетыкі павінны плаціць мясцовым Саветам высокі зямельны падатак.

На гэтых землях можна было б нешта арганізаваць: пракласці дарогі, выкарыстаць для сельскай гаспадаркі (вышыня лініі ў 4 метры дазваляе), пасадзіць дрэвы для атрымання мясцовага паліва. Але гэтым павінны займацца іншыя юрыдычныя асобы, якія не ўваходзяць у сістэму энергетыкі, а гэта забаронена законам.

— Калі б заканадаўства дазволіла двайное выкарыстанне гэтых зямель, нам удалося б вырашыць задачу павышэння надзейнасці ліній электрапередач, заплаціць падаткі мясцовым Саветам, акрамя таго, землі могуць прыносіць прыбытак, — лічаць энергетыкі.

У сваю чаргу **старшыня Пастаяннай камісіі Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК** запэўніў энергетыкаў, што іх праблемы зразумелыя для дэпутатаў камісіі, якія ўсе прыйшлі з рэальнага сектара эканомікі. «Сёння ў нашай камісіі знаходзіцца на прапрацоўцы 7 законапраектаў, з іх тры ўяўляюць найбольшы інтарэс для вашага сектара, — сказаў ён. — Асноўная наша мэта — наладзіць нармальныя, рабочыя стасункі з тымі, для каго мы гэтыя законы прымаем. Даведацца аб праблемах, намеціць шляхі іх вырашэння і разам вырашаць».

Старшыня камісіі таксама падтрымаў ідэю сумеснай работы над праектам закона «Аб электраэнергетыцы».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, фота аўтара.

«ДАРАГІЯ» ШКОЛЫ БУДУЦЬ ЗАЧЫНЯЦЦА

У Брэсцкай вобласці аддзеламі адукацыі райвыканкамаў прапанавана сёлета закрыць 19 малакамплектных сельскіх школ. Яшчэ 11 школ плануецца рэарганізаваць ва ўстановы адукацыі са змяненнем іх статусу.

— Утрыманне такіх школ вельмі дорага абыходзіцца бюджэту, — паведаміў на пасяджэнні выніковай калегіі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама **начальнік упраўлення Міхаіл ЦІХАНЧУК**. — Для параўнання: калі ў сярэднім па вобласці ўтрыманне аднаго вучня ў школе абыходзіцца дзяржаве ў 11 млн рублёў, то ў школах, дзе навучаюцца менш як 50 дзяцей, выдаткі вагаюцца ад 18 да 41 мільёна рублёў, а па асобных школах яны яшчэ большыя.

Міхаіл Ціханчук зазначыў, што ў першую чаргу будуць скарачацца школы, якія налічваюць менш як 50 навучэнцаў. Зараз у рэгіёне налічваецца 91 такая школа. Крайне нерацыянальна, на думку Міхаіла Ціханчука, таксама ўтрымліваць у школах малакамплектныя класы. У сельскіх школах рэгіёна на сённяшні дзень з напаўняльнасцю ад аднаго да пяці вучняў працуюць амаль 800 класаў (з 1-га па 11-ты), у тым ліку 89 старэйшых класаў (10-х і 11-х). Што тычыцца старэйшых класаў з такой мінімальнай напаўняльнасцю, то ў Брэсцкай вобласці стаіць задача цалкам іх скараціць.

Там, дзе будуць прымацца рашэнні па закрыцці малакамплектных школ, паралельна будуць вырашацца і пытанні падвозу дзяцей у суседнія школы. Парк школьных аўтобусаў у вобласці штогод папаўняецца новымі машынамі — у залежнасці ад патрэб таго ці іншага раёна.

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛЮТЫМ

2, субота, *2.00 — 13.00*
4, панядзелак, *13.30 — 17.00*
5, аўторак, *21.30 — 24.00*
6, серада, *0.00 — 19.00*
7, чацвер, *14.00 — 24.00*
8, пятніца, *0.00 — 20.00*
10, нядзеля, *8.30 — 22.30*
11, панядзелак, *18.00 — 24.00*
12, аўторак, *0.00 — 24.00*
13, серада, *0.00 — 3.00*
15, пятніца, *4.30 — 11.00*
17, нядзеля, *21.30 — 23.00*
19, аўторак, *20.00 — 24.00*
20, серада, *0.00 — 12.00*
22, пятніца, *3.00 — 23.00*
25, панядзелак, *6.00 — 8.00*
26, аўторак, *19.00 — 24.00*
27, серада, *0.00 — 14.00*
28, чацвер, *9.30 — 24.00*

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ПЕРАВАГА АЙЧЫННАЙ СЫРАВІНЕ

Упершыню за ўсю гісторыю Беларускага металургічнага завода доля айчыннага металалому ў агульным аб'ёме вытворчасці прадпрыемства па выніках 2012 года перавысіла імпартныя пастаўкі.

Так, летась прадпрыемства перапрацавала 1 млн 396 тысяч тон сыравіны беларускіх пастаўшчыкоў. Сёлета гэты паказчык плануецца захаваць на такім жа ўзроўні. Як паведаміў прэс-сакратар БМЗ Аляксандр Алесік, яшчэ ў 2011 годзе суадносіны імпартнага і беларускага лому, які паступае на завод, склалі 55% і 45%, адпаведна. Павелічэнне ў 2012-м долі айчыннай сыравіны дазволіла БМЗ паменшыць валютныя затраты на яго закупку за мяжой і знізіць сабекошт металу, які выплаўляецца. Лом, які збіраецца на тэрыторыі краіны і накіроўваецца ў вытворчасць, з'яўляецца для завода больш выгадным за кошт лагістыкі. Напрыклад, у параўнанні з пастаўкамі металалому з Расіі. У грашовым вымярэнні эканомія, якую ўдалося дасягнуць дзякуючы павелічэнню долі айчыннай сыравіны, склала 11,5 млн доларaў ЗША.

Аднак улічваючы пастаяннае нарошчванне вытворчых магутнасцяў на БМЗ, там адначасова з павелічэннем прыцягнення аб'ёмаў беларускай сыравіны развіваюць уласную ломанарыхтоўчую сетку ў Расійскай Федэрацыі. У прыватнасці, пашыраюцца пастаўкі праз Санкт-Пецярбург, Пскоў. Апошні пастаўляе ў Беларусь больш за паўмільёна тон лому штогод. А ўсяго больш за 20 кампаній забяспечваюць БМЗ металаломам. Гэта абумоўлена ростам патрэб прадпрыемства ў сыравіне, а таксама неабходнасцю дыверсіфікацыі паставак, што выключае з'яўленне праблем, якія нярэдка ўзнікаюць пры адсутнасці выбару партнёраў.

Леанід ТУГАРЫН.

СТОПМЕНЫ ЗНІКНУЦЬ З ПЕШАХОДНЫХ ПЕРАХОДАЎ?

З практыкі дзейнасці атрадаў стопменаў будуць выключаны навучэнцы і педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі — такое даручэнне галоўнае адукацыйнае ведамства краіны накіравала ва ўсе мясцовыя органы кіравання адукацыяй. Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў прэс-цэнтры Міністэрства адукацыі, метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі работы атрадаў стопменаў, зацверджаныя 31 ліпеня 2012 года, страцілі сваю сілу.

Нагадаем, што трагедыя ў сталічным мікрараёне «Сухарава», дзе пад коламі машыны літаральна побач з ганкам школы загінула дзевяцігадовае дзіця, скаланула ўсю грамадскасць і прымусіла зусім па-іншаму паглядзець на пытанні бяспекі нашых дзяцей. Аднак дзейнасць стопменаў, функцыі якіх усклалі на школьнікаў і педагогаў, выклікала шмат папрокаў з боку грамадскасці. Рэзка супраць дзяжурства сваіх дзяцей на пешаходных пераходах, якое выпадала на цёмны час сутак (прычым дзяжурыць школьнікам даводзілася і ў маразы, і ў снег, і ў дождж), выказаліся многія бацькі. Педагогі таксама не ўзрадаваліся яшчэ аднаму новаму абавязку.

Трэба дадаць, што дзейнасць атрадаў стопменаў, якія забяспечваюць бяспеку дарожнага руху паблізу з установамі адукацыі, — шырока распаўсюджаная ў многіх краінах практыка. Аднак там да работы ў такіх атрадах прыцягваюцца не школьнікі і педагогі, а валанцёры.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БОЛЬШ ЯК 900 ЗАЛАТЫХ І 700 СЯРЭБРАНЫХ ВЯСЕЛЬНЫХ ЮБІЛЕЯЎ

правялі ў загсах Беларусі ў 2012 годзе, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве юстыцыі.

Што датычыцца новых шлюбаў, то найбольшая іх колькасць была заключана ў Мінску (амаль 15,5 тыс.). Усяго органамі загса зарэгістравана звыш 339 тыс. актаў грамадзянскага стану. У 2012 годзе на 5 працэнтаў павялічылася колькасць рэгістрацый нараджэнняў і на 6,5 працэнта зменшылася колькасць запісаў актаў аб смерці ў параўнанні з 2011 годам. Найбольшая колькасць нараджэнняў зарэгістравана ў сталіцы (звыш 25 тыс. актаў). Сярод абласцей рэспублікі больш за ўсё нованароджаных зарэгістравана ў Брэсцкай вобласці — 17,8 тыс., а ў Гомельскай вобласці — 17,6 тыс. Самымі папулярнымі імёнамі для хлопчыкаў былі: Арцём, Мікіта, Аляксей, Максім. Для дзяўчынак: Марыя, Ганна, Настасся, Дар'я, Сафія. Сярод рэдкіх імён, якія выбіралі бацькі пры рэгістрацыі дзяцей, былі: Амадэй, Елізар, Серафім, Ярамір (для хлопч

ПАНЯДЗЕЛАК, 4 ЛЮТАГА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 18.45, 23.35 Зона Х.
9.15 У цэнтры ўвагі.
10.00 Камедыя «Хатабыч».
12.10 Клуб рэдактараў.
13.00 Вакол планеты.
13.50 Журналісцкае расследаванне.
14.25 Тайны следства.
15.10, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Камедыя «Пакроўскія вароты».
17.40 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
18.30 «Трыумф. Героям спорту». Дзённік.
19.40 Калыханка.
19.55 Серыял «Джамайка».
21.00 Панарама.
21.40 Форум.
22.40 Серыял «Бігль».
0.00 Дзень спорту.
0.10 Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Танна і добра».
12.00 «Леў Лешчанка. Ні хвіліны пакою».
13.10 «Добрага здаровейка!».
14.10 «Модны прыгавор».
15.10 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 «Ты не адзін».
Так, іх магло б не быць, калі б... Калі б нехта спыніў п'яную руку, што замахнулася нажом на дзіця. Калі б хтосьці забраў ключы ад машыны ў п'янага, што збіраўся сесці за руль. Калі б тая ж суседка пачакала, пакуль выгарыць у печы (яна ж бачыла, што гаспадары зрабіць гэта не ў стане, а дома малое). Калі б той п'янай цётцы аднойчы прадаўшчыца ў вясковым магазіне сказала «хопіць» і не прадала «доўбню» з танным віном... Калі б мы не праходзілі міма, з агідай ці са шкадаваннем гледзячы на тых, хто п'е, хто сваім п'янствам даводзіць да пакуты і галечы блізкіх людзей. (І тут шкадаванне нічым не лепшае за агіду ці пагарду, бо мы ўсё роўна ідзём міма.)

Справа тут, калі хочаце, ні больш ні менш — у нашай грамадскай свядомасці. На дзяржаўным узроўні робіцца шмат: прадугледжаны штрафы за распіццё спіртнога ў грамадскіх месцах, спынена вытворчасць танных пладова-ягадных вінаў, вядзецца барацьба з самагоншчыкамі, бацькоў-выпівох прымушаюць працаваць і плаціць за ўтрыманне адабраных у іх дзяцей, усё больш жорсткімі становяцца меры ў дачыненні да п'яных вадзіцеляў... Але гэтага недастаткова. Нам усім настаў час зразумець, перажыць, перадумаць і прыняць як рэчаіснасць: той, хто злоўжывае спіртным, сёння ўсё часцей не ціхі п'яніца, герой народных жартаў, дасціпны весялун, з якога толькі пасмяяцца варта (той вясёлы дзядзька з карчмы ўжо даўно застаўся толькі ў анекдотах ды бытавых казках). Сёння спіртное часцей і часцей ператварае чалавека ў пачвару, якая, заліўшы гарэлкай вочы, не памятаючы сябе, гатова здзекавацца, забіваць, становіцца прычынай смерці зусім не вінаватых, тых, хто проста аказаўся побач. І гэта не дзесьці там за акіянам, а ў нас трэць злачынстваў здзяйсняецца п'янымі. І гэта ў нас большасць тых, хто гіне на пажарах, было ў нецвярозым стане... Калі гэта забаліць кожнаму, а не толькі міліцыі, выратавальнікам і тым няшчасным сем'ям, якія пакутуюць ад п'яніц, можа, тады жудасных навін стане менш?

...Аўторак выдаўся лепшым. Вось толькі з Брэста навіна прыйшла. П'яны дваццаціпяцігадовы мужчына, пасварыўшыся з сужыцелькай, запёрся на кухні і пагражаў узарваць газ. Што было б, калі б у шматкватэрным доме ён гэтую пагрозу выканаў, страшна нават уявіць. Дзякуй Богу, усё абышлося.

Да наступнага разу?..

Эмілія КАВАЛЕЎСКАЯ

■

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА ОТ 01.02.2013

Сведения о застройщике: Совместное общество с ограниченной ответственностью «Лада ОМС-Инжиниринг» (СООО «Лада ОМС-Инжиниринг»). СООО «Лада ОМС-Инжиниринг» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС-Холдинг» ЗАО.

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

Режим работы: рабочие дни с понедельника по пятницу с 8.30 до 19.00, суббота с 09.00 до 15.00; выходной день – воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191118730.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 на ул. Грушевской в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом №15 на ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 на ул. Щорса;
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 на 3-й ул. Щорса.

Цель проекта – строительство объекта «Комплекс многоэтажных жилых домов с объектами общественного назначения на территории в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой со сносом существующей усадебной жилой застройки в границах ул. Маяковского, ул. Аранской, ул. Денисовской, р. Свислочь и выделением 1-ой очереди многоэтажный жилой дом со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения. Жилой дом № 5 по генплану» (1-й пусковой этап) с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации:
Начало строительства – май 2011 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – июль 2013 г.

У Застройщика имеются:
- решение Мингорисполкома о разрешении строительства от 24.03.2011 № 731;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 04.10.2010 № 1085-15/10).

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, территория в границах ул. Маяковского, ул. Оранжерейной, ул. Луговой, пер. Полевой.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства.
По жилому дому:
- 1-комнатные – 10 шт.
- 2-комнатные – 10 шт.
- 3-комнатные – 10 шт.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (без отделки) составляет:
- 1-комнатные квартиры – 1480 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты;
- 2-комнатные квартиры – 1450 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты;
- 3-комнатные квартиры – 1400 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты.

Платежи по договору создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь в день оплаты.

Данные о правах застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен застройщику решением Мингорисполкома от 24.03.2011 №731 площадью 0,3737 га.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию – июль 2013 г.

Сведения о договорах строительного подряда: договор подряда с СООО «Гранитстройинвест» от 28.03.2011 № 28-03/1.

Условия ознакомления с информацией по проекту:
тел.: 8-017-220-40-43, VELCOM 8-029-699-40-93, 8-029-699-40-32, 8-029-545-10-32; на сайте http://www. lada-park.by/ либо по адресу: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 2Н, комн. 3а.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВ ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

Продавец – Ивьевский районный исполнительный комитет.
Организатор – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Аукцион состоится в 12.00 5 марта 2013 г. в г. Ивье, Гродненской обл по ул. Комсомольская, д.1, кабинет 5.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.
Последний день приема заявлений – 01 марта 2013 г. до 15.00.
Телефон для справок: 8 0152 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Дополнительная информация: www.ino.by

Номер лота	1	2	3
Адрес земельного участка, кадастровый номер	Д. Морино, 422983807100000001	Д. Лелюки, 422982806101000159	Г. Ивье, ул. 1-ое Мая, 422950100001002320
Целевое назначение земельного участка	Для размещения объектов розничной торговли	Для строительства магазина	Для строительства автомобильной стоянки
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества	1 16 03 – земельный участок для размещения объектов розничной торговли	1 16 03 – земельный участок для размещения объектов розничной торговли	1 16 05 – земельный участок для размещения автостоянок и гаражей
Срок аренды	5 лет	5 лет	10 лет
Площадь, га	0,0048	0,0750	1,0715
Форма участка	Прямоугольная	Прямоугольная	Прямоугольная
Рельеф участка	Равнинный	Равнинный	Равнинный
Расположение земельного участка	Северо-западная часть населенного пункта	Восточная часть населенного пункта	Западная часть города
Расположение участка в массиве застройки	Не угловой	Не угловой	Угловой
Транспортная доступность	В радиусе 500 метров от центра населенного пункта	В радиусе 500 метров от центра населенного пункта	В радиусе 500 метров от центра населенного пункта
Инженерная инфраструктура	Существует возможность подключения к сетям: электричество.	Существует возможность подключения к сетям: электричество	Существует возможность подключения к городским сетям: электричество с условиями, газоснабжение
Экологическое состояние	Благоприятное	Благоприятное	Благоприятное
Наименование ограничений в праве	Водоохранная зона водных объектов	В водоохранной зоне водных объектов на площади 0,0423 га, охранной зоне линии электропередачи на площади 0,0167 га	В охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения на площади 0,0108 га, охранной зоне линии электропередачи на площади 0,0282 га
Начальная цена земельного участка, руб.	127 520 (сто двадцать семь тысяч пятьсот двадцать) белорусских рублей	132 453 (сто тридцать две тысячи четыреста пятьдесят три) белорусских рубля	43 004 680 (сорок три миллиона четыре тысячи шестьсот восемьдесят) белорусских рублей
Задаток, руб.	12 752 (двенадцать тысяч семьсот пятьдесят два) белорусских рубля	13 245 (тринадцать тысяч двести сорок пять) белорусских рублей	4 300 468 (четыре миллиона триста тысяч четыреста шестьдесят восемь) белорусских рублей
Дополнительное условие	Победителю аукциона возместить денежные средства: - за право заключения договора аренды; - за проведение аукциона.	Победителю аукциона возместить денежные средства: - за право заключения договора аренды; - за проведение аукциона; - государственную регистрацию создания земельного участка; - изготовление землеустроительных документов.	Победителю аукциона возместить денежные средства: - за право заключения договора аренды; - за проведение аукциона; - государственную регистрацию создания земельного участка; - изготовление землеустроительных дел.

Условия заключения договора аренды земельного участка победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона):

внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

заключение победителем аукциона с райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после получения выписки из решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе).

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Номер р/с для перечисления задатка Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «МИНСКСТРОЙ»
ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ о строительстве жилых помещений объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса–пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». (2 пусковой комплекс) в г. Минске,
опубликованную в газете «Звязда» 28 июня 2012 года:

Ожидаемый ввод 2 пускового комплекса жилого дома в эксплуатацию – 5 июля 2013 г.

Генеральный директор Н.В.Милошевский

УНП 100071325

У суд Фрунзенскага раёна г. Мінска паступіла заява аб аб'яўленні памерлым **Прышчэпава Аляксандра Афанасьевіча**, 23.08.1934 г.н., ураджэнца г. Мінска, які пражываў у г. Мінску, па вул. Адоеўскага, 95—31. Апошняе вядомае месца яго знаходжання — Пухавіцкі раён, Мінская вобласць.

Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Прышчэпава Аляксандра Афанасьевіча, паведаміць іх суду Фрунзенскага раёна г. Мінска на адрас: 220092, г. Мінск, вул. Дуніна-Марцінкевіча, 1—2—132 на працягу 2 месяцаў з моманту публікацыі.

Утерянные полисы страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БА №№ 0259767, 0332634, 0316660, серии СО №№ 0011503, 0011681; страховые полисы по гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВС №№ 9135291, 9093043; квитанция формы 1СУ серии КС № 3619878; по добровольному страхованию формы 2РН, 2РП серии ПЕ №№ 0052347, 0052348, 0052349 **считать недействительными.** УНП 100357923

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

15.03.2013 г. в 10.00 в здании Скидельского городского исполнительного комитета (г. Скидель, ул. Ленина, 45) **состоится аукцион продажи земельного участка в частную собственность**

Кадастровый номер и адрес земельного участка	Площадь земельного участка, га	Целевое назначение земельного участка	Вид вещного права	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, руб.*	Инфраструктура и условия инженерного развития земельных участков
422050400001000748, Республика Беларусь, Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Садовая, участок № 15 (по генплану).	0,1267	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома	Частная собственность	28 000 000	4 444 780	Инженерные сети: газоснабжение; водоснабжение; электроснабжение; электросвязь.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) со дня опубликования настоящего извещения и **до 17.00 11.03.2013 г.** представляет в комиссию по организации и проведению аукциона продажи в частную собственность земельных участков по адресу: **г. Скидель, ул. Ленина, 45, кабинет 1**, документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в частную собственность по результатам аукциона;

заверенную копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона на расчетный счет Скидельского горисполкома, филиал № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 752, № 3600514120189, УНН 500045119, назначение платежа 04901 – продажа в частную собственность;

гражданин – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представитель гражданина – нотариально удостоверенную доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.

Осмотр земельного участка осуществляется претендентами на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема заявлений.

Контактные телефоны: (0152) **974-071,** (0152) **975-056,** (0152) **975-241**.

Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462.

Шаг аукциона – 5% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного дополнительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 31 января 2013 года поощрительный дополнительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- **«Классик плюс»**, **«Сберегательный»**, «**Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) – в размере **9% годовых**;
- **Накопительный**, **Премиально-накопительный «Детский», «Новый 2010»** – в размере **7% годовых.**

Начисление поощрительного дополнительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 31.01.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 27.02.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного дополнительного процентного дохода производится 28.02.2013.

При этом поощрительный дополнительный процентный доход не выплачивается:

- в случае если в период с 31.01.2013 по 27.02.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 года) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 31.01.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Новый 2010», срок возврата которых наступил до 31.01.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного дополнительного процентного дохода производится с 28.02.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного дополнительного процентного дохода.

ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 01.02.2013г. процентную ставку в размере 40% годовых:
- по вновь принимаемым срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях «**Гарантированный доход»** на 15 дней (по ранее принятым вкладам установленный размер процентной ставки применять с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 01.02.2013);
- по вновь оформляемым **сберегательным сертификатам** со сроком обращения 95 дней.

Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-Центре по тел 147 и на сайте www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и стоимость	**Лот № 1.** Капитальное строение инв. № 200/С-81240 (здание центрального склада) общей площадью 194,3 кв.м, одноэтажное кирпичное здание с кирпичными стенами и железобетонными перекрытиями, 1979 года постройки условный земельный участок с кадастровым номером 240100000002007001, площадью 468 м². Местонахождение объекта: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 170, корп. 1. Капитальное строение инв. № 200/С-81239 (здание дома быта) общей площадью 279,3 кв.м, одноэтажное здание со сборно-щитовыми стенами и деревянными перекрытиями, условный земельный участок с кадастровым номером 240100000002007001, площадью 706 м². Местонахождение объекта: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 170. Имеется доступ автомобильного транспорта. Начальная стоимость лота 342 036 000 рублей.
Собственник (владелец) имущества	**КУП ОБУ «Витрайбыт» (г. Витебск, ул. Ленинградская. 4, УНП 300064006).**
Наличие обременений	**Залог ОАО «Белинвестбанк».**
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 19 февраля 2013 года в 11.00**
Справочная информация	**Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс: 80212491342, 80291502410. Старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел. 80212491343**
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 не позднее 11.00 19.02.2013. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «Завод «Электроника»

Лот № 1. Здание специализированное для производства электротехнического, электронного и оптического оборудования с инвентарным номером 500/С-41364. Кадастровый номер земельного участка: 500000000004004781, этажность – 2. Адрес: г. Минск, ул. Корженевского, д. 14, площадью 2154,9 кв.м. Стоимость: 10.377.427.000 рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска.

Торги состоятся 26 февраля 2013 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201

За дополнительной информацией обращаться: Старший судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел.: 294-93-67

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

■ Партрэт часу — праз Слова

Эстэтыка і прыгажосць старой Кнігі

У Мінску па вуліцы Калініна ёсць цікавая крама — «Кніжны салон». Гэта — сапраўдны салон. Бо сюды зазіраюць не толькі пакупнікі, але яшчэ і слухачы, гледачы многіх сустрэч з пісьменнікамі, імпрэз, прысвечаных новым і старым, ранейшых гадоў (а то і стагоддзяў — напрыклад, XVII—XVIII!) кнігам. Вось мы і вырашылі пагутарыць з дырэктарам кнігарні Алай ЗМІЁВАЙ (якая яшчэ і дырэктарам выдавецтва «Навуковы свет» з'яўляецца) пра розныя стасункі кніжнага пакупніка і кніжнага гандляра і дзе ў гэтых стасунках — муза, а дзе мамона...

— Крама «Кніжны салон» сёння яшчэ і букіністычная прастора... Чым было выклікана такое рашэнне? Займацца букіністыкай, старой кнігай дастаткова складана, не заўсёды выгадна...

Кніга — традыцыйная крыніца сакральных ведаў, калі сам зварот да яе ўжо прадугледжвае святое хваляванне. Гэта артэфакт, сведчанне культурнага, інтэлектуальнага, гуманітарнага ўзроўню.

— Канцэпцыя «Кніжнага салона» прадугледжвае сустрэчы аўтараў з чытачамі, прыцягненне прадстаўнікоў беларускай бібліяфільскай грамады на рэгулярныя клубныя пасяджэнні. А таксама — прафесійныя літаратурныя і лінгвістычныя дыскусіі. Гэта патрабуе, каб на нашых паліцах быў асартымент пад густ самых патрабавальных наведвальнікаў. І каб прадстаўляць айчынныя выдавецтвы напоўніцу, а не толькі навінкамі, мы распрацавалі канцэпцыю гандлю, дзе без старой кнігі не абысціся. Дарэчы, тут і больш шырокі дыяпазон цэн. Калі летам мінулага года разам з тавараведам Ірынай Зубар адкрывалі букіністычны аддзел, то вось на што разлічвалі... Пакупнік, прыцягнуты ў краму недарагімі цэнамі на старыя кнігі, пажадае купіць і актуальныя выданні. А цэны на іх у розных крамах практычна не адрозніваюцца. Вопыт, прафесіяналізм Ірыны Георгіеўны ў букіністычным гандлі дапамаглі граматна збалансаваць рэпертуар кніжных паліц. Адбор быў самы строгі. За кошт збіральнікаў букіністычнай кнігі мы і спадзяваліся пашырыць кола пакупнікоў.

— І гэта ўдалося?

— Сёння з радасцю адзначаем, што шмат хто з тых, хто зайшоў да нас паглядзець на старыя кніжкі, ужо сталі нашымі пастаяннымі пакупнікамі. Вядома, у колькасным вымярэнні гэта не такі і вялікі атрад, але гэтыя людзі становяцца сябрамі «Кніжнага салона» на доўгі час.

— Як расказваюць старыя збіральнікі, некалі ездзілі ў Ленінград і пешшу абыходзілі ўсе «кропкі» букіністыкі...

— Няхай сабе такіх «кропак» у Мінску і няшмат, але ж можна і ў нас выправіцца ў такую букіністычную вандроўку па горадзе пешшу. Наведаць краму па вуліцы Карла Маркса, пасля — каля станцыі метро «Плошча Якуба Коласа», а тады і да нас зазірнуць... Ёсць тут сацыяльны момант... Прыходзяць пенсіянеры, людзі сціплага дастатку, а новыя кнігі каштуюць добрую капейчыну... А мы ж вырашылі вярнуць лозунг: «Кніга — лепшы падарунак». І не толькі адрадзіць яго, але і даць магчымасць кожнаму наведвальніку рэалізаваць дэкларацыю. Таму і прапануем у якасці падарункаў сімпатычныя беларускія выданні, якія адрукаваны пры фінансавай падтрымцы дзяржавы. А яшчэ — дарагія эксклюзіўныя кнігі як падарунак для «прадстаўнічага класа» і рэдкія, нават рарытэтныя выданні, век якіх у чыёйсьці прыватнай калекцыі мінуў. І цяпер яны знаходзяць праз нашы букіністычны аддзел новых пакупнікоў. У большасці выпадкаў у пэўнай тэматычнай групе не аддзяляем новую і старую кнігу. Хіба што антыкварныя кнігі і эксклюзіўныя выданні ў аўтарскіх пераплётах асобна вылучаны.

— Вы яшчэ і выдавец... Для арганізатара кніжнага гандлю выбар няпросты і не такі ўжо часты... Чым кіраваліся, прымаючы такое рашэнне?

— Якраз для мяне гэты выбар быў дастаткова простым, натуральным, эвалюцыйным. Таксама як пасля дзясятка гадоў у кніжным бізнэсе мне захацелася тры гады таму ажыццявіць і некаторыя эстэтычныя ўяўленні ў стварэнні незвычайнага на той час для Мінска кніжнага салона. Так і цяпер мой кніжны праект — гэта вынік вопыту. Вынік натхнення, якое атрымала ў стасунках з бібліяфільскай грамадой. Хочацца вярнуцца да вытокаў, усвядоміць, што традыцыйная папяровая кніга сёння — гэта не крыніца інфармацыі, паколькі ў яе ёсць больш ёмістыя канкурэнты. Нават бязмежныя, як інтэрнэт, а кніга — гэта артэфакт, сведчанне культурнага, інтэлектуальнага, гуманітарнага ўзроўню. У асобных выпадках друкаваная кніга — гэта твор мастацтва.

— Сапраўды, гісторыя Старога Свету, як і гісторыя Русі, і ўжо ў сваю чаргу гісторыя беларускіх земель вядомыя настолькі, наколькі яны адлюстраваны ў рукапісных, а пазней і ў друкаваных крыніцах...

— Так, і няма сёння крыніцы інфармацыі больш надзейнай па захаванасці, чым папяровая друкаваная кніга. Хоць я ніколькі не сумняваюся, што будучы не менш надзейны носьбіт інфармацыі стагоддзяў яшчэ вынайдуць. Але зараз тэксты, розныя графічныя і іншыя звесткі, якія знаходзяцца ў лічбе, дублююцца і ў прынце і захоўваюцца ў абодвух фарматах. Варта нават крыху адхіліцца ад утылітарнага прызначэння кнігі: прачытаў і выкінуў — безумоўна, дзеля гэтага высякаць дрэвы не варта. Лагічней выкарыстаць сучасныя тэхналогіі, напрыклад, прымальныя і ёмістыя электронныя рыдары. Кніга — традыцыйная крыніца сакральных ведаў, калі сам зварот да яе ўжо прадугледжвае святое хваляванне. Да таго ж кніга заўсёды была дарагім задавальненнем. І як правіла, гісторыі славутых бібліятэк — сведчанне іх арыстакратычнай «біяграфіі». Так што, выдавецтва «Навуковы свет» працуе пад бібліяфільскім лозунгам Ad librum, што ў перакладзе з латыні азначае: «Да кніг!».

Фотадэманстрацыя Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Першыя кнігі выдавецтва «Навуковы свет» паказваюць, што напрамак у вас дастаткова складаны і, мякка кажучы, не зусім грашовы... Ці могуць бібліяфільскія праекты рэалізоўвацца ў такой прасторы, як Мінск, як Беларусь?..

— Вось наш вопыт і пакажа, ці могуць яны рэалізоўвацца...

Свята ўпэўнена, што бібліяфільскае кнігавыданне — неабходны ланцужок у адраджэнні бібліяфільскіх традыцый у Беларусі. Нам ёсць на што абапірацца!.. Беларуская зямля дала свету Францыска Скарыну, мы маем найбагацейшую кніжную выдавецкую і збіральніцкую традыцыю з часоў Еўфрасінні Полацкай. На працягу ўсёй гісторыі славутыя беларускія роды — Радзівілаў, Сапегаў, Тызенгаўзаў — мелі багатыя кніжныя калекцыі. А кожны з гэтых зборaў быў адзначаны асаблівым фамільным кніжным знакам. Дададзім да гэтага традыцыю літаратурных салонаў у Нясвіжскім замку. А далей такія імёны, як Вацлаў Ластоўскі, Анатоль Тычына, і пазней бібліяфільства савецкага перыяду (Барыс Сачанка, Максім Лужанін і інш.). На вялікі жаль, большасць бібліяфільскіх аб'яднанняў і таварыстваў калекцыянераў савецкага часу перасталі існаваць, а новыя за апошні час так і не з'явіліся. У выніку мы істотна адстаём ад заходняга бібліяфільскага руху, як у кніжным калекцыянаванні, так і ў антыкварна-букіністычным гандлі. І калекцыянеры і гандляры антыкварнай кнігі адчуваюць пэўны інфармацыйны голад. Каб выправіць сітуацыю мы ствараем ўмовы ў сваім салоне для стасункаў, абмену вопытам, сустрэч калекцыянераў і прафесіяналаў кніжнай справы. З падобных дыскусій і нарадзіўся наш выдавецкі праект.

Мы пакуль адстаём ад заходняга бібліяфільскага руху як у кніжным калекцыянаванні, так і ў антыкварна-букіністычным гандлі. І калекцыянеры, і гандляры антыкварнай кнігі адчуваюць пэўны інфармацыйны голад.

— Наколькі шматпланавай будзе серыя, прысвечаная беларускаму экслібрысу? Ці будзеце вы прадстаўляць мастакоў-графікаў, пра якіх сёння, лічы, забыліся?..

— Ідэя праекта ўзнікла недзе каля года таму. І тады я не думала, што акрамя ўнікальнай бібліяфільскай формы, у нашай серыі «Беларускі ex libris» з'явіцца перспектыва стаць найбольш поўным у гісторыі айчыннай кнігі зборам па тэме беларускага кніжнага знака. Вядома, узрастае адказнасць за вынік. Калі ў першай серыі, якая складаецца з васьмі кніг, сімвалічна пранумераваных літарамі магічнага слова «exlibris», выходзіць восем адвольна выбраных графікаў (ужо выйшлі кнігі А. Кашкурэвіча, А. Ціхановай, М. Селяшчука, рыхтуюцца да друку альбомы Ю. Якавенкі, Г. Вяля і інш.), то далейшая праца над серыяй вызначана большай сістэмнасцю. Знойдзецца месца і «гістарычнаму экслібрысу» (якраз туды увойдуць кнігі А. Тычыны і Ціхановічай, Я. Куліка, старабеларускі экслібрыс, кніжны знак XIX—пачатку XX ст.). Вылучым і «класіку» (Г. Грак, М. Басалыга і інш.). Асобна — сучасны беларускі экслібрыс. Паўнавартаснай рэкламы нашай серыі яшчэ не было, таму цяжка сказаць, ці будзе яна самаакупнай. З бібліяфільскага накладу ў 99 экзэмпляраў пакуль прадаецца толькі невялікая колькасць калекцыйных камплектаў. Выдаткі на выпуск істотныя. Нават папера — дызайнерская італьянская, якую мы наўмысна прывозім у Мінск. Вельмі якасная пераддрукарская падрыхтоўка, маленькі наклад афсетнага друку, плюс наяўнасць адбіткаў у калекцыйных пранумараваных асобніках. На выхадзе выданне атрымліваецца нязвыклага дарагім для нашага кніжнага рынку, каля 300 тысяч рублёў... Разлічваць на выпадковы продаж у краме наўрад ці даводзіцца. Спадзяюся на еўрапейскіх і расійскіх калекцыянераў экслібрысаў, каб вярнуць укладзеныя сродкі. Спецыяльна для замежных бібліяфілаў мы робім выданне на беларускай і англійскай мовах. Аднак зарабіць на такім выданні — не галоўная задача. Будуць і паралельныя, камерцыйныя, праекты.

— Як актыўны кніжнік, арганізатар гандлю, бібліяфільскага руху, як выдавец, якія вы бачыце праблемы з афармленнем кнігі ў Беларусі, а адпаведна і з развіццём кніжнай графікі ў нашай краіне?

— Кнігавыданне ў Беларусі знаходзіцца на вельмі добрым узроўні і па рэпертуары, і па якасці кнігі. І ў адным, і ў другім пытанні, безумоўна, ёсць свае нюансы. Пры аб'ектыўнай малатыражнасці (1000-2000 экз.) пэўная частка беларускіх выданняў не можа быць камерцыйна паспяховай ці нават самаакупнай. Неабходна фінансавая падтрымка дзяржавы, і яна ёсць. Калі дзяржава будзе і надалей падтрымліваць выдаўцоў, то і мы будзем мець магчымасць набываць як новыя выданні беларускай класікі, так і творы сучасных аўтараў. Што датычыць фармата сучаснай кнігі, то як быццам і з якаснымі падарункавымі выданнямі справы складваюцца не так дрэнна. Але гэта ў выпадку, калі праект з'яўляецца сацыяльна значным ці нацыянальна брэндавым (напрыклад, альбом партрэтаў Радзівілаў). Калі размова ідзе пра мастацкую творчасць асобных майстроў, скажам, выяўленчага мастацтва ці мастацкай фатаграфіі, то часцей за ўсё яны прадастаўлены самі сабе. Як і ўсюды ў цывілізаваным свеце падобныя праекты ў нашай краіне, як правіла, выходзяць пры спонсарскай падтрымцы прыватнікаў ці на грошы мецэнатаў. Падобная традыцыя ў Беларусі толькі адраджаецца...

Чалавек з дастаткам разумее, што асабістая бібліятэка — такі ж значны паказчык яго статусу, як і іншыя матэрыяльныя складнікі, уключаючы калекцыі жывапісу ці антыкварыяту. А вось пашыраць свае бібліяфільскія веды — менавіта гэтаму і спрыяюць зносіны ў асяродку аднадумцаў і прафесійных кніжных спецыялістаў. Хаця нават калі паглядзець у гістарычным разрэзе, далёка не кожны ўладальнік бібліятэкі быў бібліяфілам. Часта кнігі не чыталіся, а набываліся для ўкладвання сродкаў.

— Пра выданне якой кнігі вы марыце?

— Акрамя работы над серыяй «Беларускі ex libris», ёсць шэраг іншых праектаў. Яны звязаны з унікальнымі беларускімі графікамі — народным мастаком Беларусі Арленам Кашкурэвічам і Юрыем Якавенкам, які вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за працу над кнігай У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха», а таксама за эксклюзіўнае афармленне кнігі Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». У канцы кожнага рабочага дня праглядаю папкі з матэрыяламі да маіх самых запаветных выдавецкіх праектаў. І пераконваюся, што мне неверагодна пашчасціла займацца такой цікавай творчай справай. Ад гэтага натхнення, здараецца, прыходзяць у снах якія-небудзь падказкі для маіх будучых кніг.

Гутарыў Сцяпан МІРШЧЫНА

Даты. Падзеі. Людзі

1913 год — нарадзіўся Сяргей Восіпавіч Прытыцкі — чалавек, які яшчэ пры жыцці стаў легендай, дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У студзені 1936 года па заданні ЦК КПЗБ у Віленскім акруговым судзе падчас працэсу над 17 рэвалюцыянерамі страляў у правакатара, пры арышце быў цяжка паранены. У чэрвені асуджаны да смяротнага пакарання. Дзякуючы пратэстам працоўных Заходняй Беларусі, Польшчы, СССР, ЗША і іншых краін прысуд заменены на пажыццёвае турэмнае зняволенне.

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў абраны дэпутатам Нацыянальнага сходу. Ад імя Паўнамоцнай камісіі Нацыянальнага сходу 12 лістапада 1939 года выступіў у Вярхоўным Савеце СССР з заявай аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР. У 1939-1941 гадах з'яўляўся намеснікам старшыні Беластоцкага аблвыканкама. У Вялікую Айчынную вайну ў 1942-1944 гадах — другі сакратар ЦК ЛКСМБ, затым намеснік начальніка, начальнік Польскага штаба партызанскага руху. У 1949-1962 гадах быў першым сакратаром Гродзенскага, Баранавіцкага, Маладзечанскага, Мінскага абкамаў КПБ. Пасля працаваў сакратаром ЦК КПБ, старшынёй партыйна-дзяржаўнага кантролю ЦК КПБ і СМ БССР, намеснікам старшыні СМ БССР. З 1968 года старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Памёр у 1971 годзе.

1851 год — у порце нямецкага горада Кіль прайшлі выпрабаванні першай падводнай лодкі. Афіцэр Вільгельм Баўэр з двума памочнікамі залез у сканструяваную ім жа субмарыну «Марскі нырэц» і пагрузіўся на дно на глыбіню 15 метраў. Аднак падняць затым лодку на паверхню яны не змаглі. Толькі пасля таго, як ціск унутры «нырца» з-за вады, якая прасачылася скрозь абіўку, зраўняўся з вонкавым, выпрабавальнікі адкрылі люк і выбраліся на паверхню — якраз у сярэдзіне цырымоніі... іх адпявання на беразе: бо з моманту апускання лодкі прайшло сем з паловай гадзін. Больш шчаслівым быў лёс другой падлодкі Баўэра — «Марскі д'ябал». Сваё новае стварэнне ён пабудаваў у Расіі і паспяхова прадэманстраваў у Кранштаце ў верасні 1856 года падчас урачыстасцяў з нагоды каранацыі імператара Аляксандра II. У экіпаж з 11 чалавек былі ўключаны музыканты, і людзі на борце судоў, што знаходзіліся ў гавані, чулі гукі расійскага гімна, якія раздаваліся з-пад вады. Тады ж былі зроблены і першыя падводныя фотаздымкі праз ілюмінатары лодкі.

1953 год — нарадзіўся (горад Гомель) Аляксандр Альбертавіч Панкоў, беларускі вучоны ў галіне ядзернай фізікі высокіх энергій і элементарных часціц, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па фенаменалагічным аналізе прадказання электраслабай тэорыі элементарных часціц, па пошуку новых фізічных аб'ектаў і з'яў нестандартнай фізікі, па электрон-пазітронных і андронных калайдарах.

Было сказана

Мялецій СМАТРЫЦКІ (1577-1633), царкоўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік-палеміст:

«Як добры плод сведчыць пра добрае дрэва, гэтак і добрыя норавы ў дзяцей пра добрых бацькоў гавораць».

■ «Хварэем» за нашых!

Новы замах на чэмпіёнства ў Вышэйшай лізе КВЗ

Зборная БДУ зноў увайшла ў эліту Клуба вясёлых і знаходлівых і будзе сёлета гуляць у Вышэйшай лізе КВЗ! Такое рашэнне прыняло журы Міжнароднага фестывалю КВЗ «Ківін-2013» у Сочы, дзе па традыцыі вызначаюцца каманды-ўдзельнікі Вышэйшай лігі на новы сезон.

Сёлета фестываль сабраў 497 камандаў з Беларусі, Расіі, Арменіі, Грузіі, Ізраіля, Казахстана, Кыргызстана, Латвіі і Украіны, таму барацьба была надзвычай вострай.

Ужо 17 лютага зборная БДУ возьме ўдзел у 1/8 фіналу гэтых спаборніцтваў. Сапернікамі нашай зборнай стануць вопытныя гульцы, якія ўжо заваявалі глядацкія сімпатыі — зборная Камызяцкага краю (Астраханская вобласць), «Днепр» (Днепрапятроўск), «Ананас» (Вязьма), а таксама «Зборная СНД па вольнай барацьбе» (Сургут).

Нагадаем, што каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта двойчы — у 1999 і 2001 гадах — станавілася чэмпіёнам Міжнароднага саюза КВЗ. Да таго ж у 2000 годзе яна заваявала летні Суперкубак чэмпіёнаў, а ў 2011 годзе — галоўны прыз «Ківін у залатым» на Міжнародным музычным фестывалі КВЗ, які штогод праходзіць у Юрмале.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Тэктоніка. Друкь. Марка. Барда. Гарэт. Радно. «Амок». Абарджак. Рэтата. Азам. Катар. Гронка. Абабак. Кут. Гара. Маянка. Іран. Дзяка. Маа. Страчы. Крама. Пікет. «Ака». Разак. Тарас. Кантэйнер.

Па вертыкалі: Канадыйат. Ластак. Брама. Аліда. Тагар. Радно. Абабак. Кут. Гара. Маянка. Іран. Дзяка. Маа. Страчы. Крама. Пікет. «Ака». Разак. Тарас. Кантэйнер.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.56	17.51	8.55
Віцебск	8.50	17.36	8.46
Магілёў	8.46	17.41	8.55
Гомель	8.37	17.41	9.04
Гродна	9.11	18.07	8.56
Брэст	9.06	18.09	9.03

Месяц

Апошняя квадра 3 лютага. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Антона, Арсенія, Макара, Марка, Мікалая, Пятра, Фёдара.*
К. *Брыгіты, Ігната.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	0..+2°С	КІЕЎ	+3..+5°С	РЫГА	-2..0°С
ВІЛЬНЮС	-2..0°С	МАСКВА	-1..+1°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	-3..-1°С

УСМІХНЕМСЯ

У сям'і спрэчка, хто пойдзе забіраць сына з дзіцячага садка.

Муж: — Я табе на Новы год футра падарыў?

Жонка: — Падарыў!

— Зімовыя боты падарыў?

— Падарыў!

— Ну, вось і ідзі па сына!

— А чаму не ты?!

— У чым?! У шкарпэтках і з пенай для галення?!?

Жонка багацея наймае нянечку:

— А чаму вам адмовілі ад ранейшага месца?

— Я аднойчы забылася выкупаць дзіця...

Голас з дзіцячай:

— Мы бяром яе, матуля!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 61, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 25.903. Індэкс 63850. Зак. № 461.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2013 года.